застаюцца на сённяшні дзень мала вывучанымі, а іх месца ў існуючых класіфікацыях складаназалежных сказаў – дыскусійным.

### ЛІТАРАТУРА


1. Беларуская граматыка : у 2 ч. / Акад. навук БССР, Ін-т мовазнаўства ; рэд.: М. В. Бірыла, П. П. Шуба. – Мінск : Навука і тэхніка, 1985–1986. – Ч. 2: Сінтаксіс / Л. А. Антанюк [і інш.]. – 1986. – 327 с.
2. Беларуская мова : вучэб. дапам. для 11-га кл. / Г. М. Валочка [і інш.]. – 2-е выд., перапрац. і дап. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2016. – 256 с.
3. Беларуская мова : вучэб. дапам. для 9-га кл. / Н. М. Гардзей, П. Л. Навіцкі, З. М. Тамашэвіч ; пад рэд. Н. М. Гардзей. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2011. – 264 с.
4. Бурак, Л. І. Сучасная беларуская мова: Сінтаксіс. Пунктуацыя / Л. І. Бурак. – Мінск : Універсітэцкае, 1986. – 319 с.
5. Граматыка беларускай мовы : у 2 т. / Акад. навук БССР, Ін-т мовазнаўства; рэдкал.: К. К. Атраховіч (Крапіва) [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1962–1966. – Т. 2 : Сінтаксіс. – 1966. – 756 с.
6. Карзон, А. С. Граматыка беларускай мовы. Ч. 2 : Сінтаксіс / А. С. Карзон, М. І. Жыркевіч. – Мінск : Дзярж. выд-ва БССР, 1946. – 172 с.
7. Кароткая граматыка беларускай мовы : у 2 ч. ; навук. рэд. А. А. Лукашанец. – Мінск : Беларус. навука, 2009. – Ч. 2 : Сінтаксіс. – 240 с.
8. Карский, Е.Ф. Белорусы : в 3 т. / Е.Ф. Карский. – 3-е изд. – Минск : Беларус. Энцыкл., 2006–2007. – Т. 2, кн. 2 : Язык белорусского народа ; коммент. В. Н. Курцовой. – Минск, 2006. – 512 с.
9. Клюсаў, Г. Н. Сучасная беларуская пунктуацыя / Г. Н. Клюсаў, А.Л. Юрэвіч. – Мінск : Выш. шк., 1972. – 280 с.
10. Лёсік, Я. Сынтакс беларускае мовы / Я. Лёсік. – 2-е выд., пераробл. – Мінск : Дзяржвыд. Беларусі, 1926. – 255 с.
11. Рамза, Т. Р. Сінтаксіс: тэарэт. курс : вучэб. дапам. / Т. Р. Рамза. – 2-е выд., дапрац. і дап. – Мінск : БДУ, 2006. – 214
12. Русская грамматика : в 2 т. / АН СССР, Ин-т русского языка ; редколл. Н. Ю. Шведова (гл. ред.) [и др.]. – М. : Наука, 1980. – Т. 2 : Синтаксис. – 1980. – 709 с.
13. Светлик, Я. Синтаксис русского языка в сопоставлении со словацким / Я. Светлик. – Братислава : Словац. пед. изд-во, 1970. – 352 с.
14. Тарашкевіч, Б. Беларуская граматыка для школ / Б. Тарашкевіч. – 6-е выд. – Мінск, 1943. – 104 с.
15. Яўневіч, М. С. Сінтаксіс сучаснай беларускай мовы : падручнік / М. С. Яўневіч, П. У. Сцяцко. – Мінск : Аверсэв, 2006. – 286 с.


---


***Маліноўская А. М. (Маладзечна, Беларусь)***


## ОНІМ «СУСЕДЗІ» Ў ЗАГАЛОЎКАХ БЕЛАРУСКАГА АПАВЯДАННЯ 20-Х ГАДОЎ ХХ СТАГОДДЗЯ

Мастацкае пазнанне жыцця дасягаецца ў творы перш за ўсё праз паказ чалавека, асобы, праз раскрыццё вобразаў-характараў [1, с. 64]. Пра разнастайнасць мастацкіх тыпаў у беларускай прозе 20-х гадоў ХХ стагоддзя сведчаць загалоўкі многіх твораў, напісаных у гэты перыяд.

Значная ўвага надавалася мастацкаму апісанню такога чалавечага тыпу, як «людзі-суседзі». Так, ствараючы вобразы герояў апавяданняў, К. Крапіва акцэнтавана падкрэсліваў іх шараговасць, звычайнасць. І зусім невыпадкова самы салідны па аб’ёме зборнік апавяданняў ён назваў «Людзі-суседзі» (1928). Першапачаткова апавяданне, якое дало назву зборніку, называлася больш эмацыянальна – «Ну й людзі! Ну й суседзі!» (1925).



Вельмі каларытныя людзі-суседзі ў К. Крапівы. Яны і грэшныя, і смешныя. Часам нават цяжка адрозніць, дзе іх віна, а дзе бяда. Менавіта таму ў аўтарскім поглядзе на герояў адчуваецца часцей за ўсё спагадлівая ўсмешка. Затое галоўны герой апавядання «Мой сусед» (1927) не выклікае ніякіх аўтарскіх сімпатый, хоць і падаецца чалавекам цалкам рэспектабельным. Працоўную дзейнасць «сусед» Міхаіл Іванавіч Лукавіцын пачаў настаўнікам мясцовай гімназіі, пісаў вернападданіцкія вершы і ставіў вучням «едзініцы» за тое, што яны гаварылі «румка» замест правільнага «рюмка». У час вайны большага за яго ўра-патрыёта ў ваколіцах не было, але ад фронту Лукавіцын адкруціўся. Здолеў «сусед» прыстасавацца і пры Саветах. З пачаткам беларусізацыі ён – цяпер ужо Міхась Цыбулевіч – стаў не проста шчырым, а выдатным беларусам. Усе свае ранейшыя вершы перарабіў на пралетарска-рэвалюцыйна-беларускі лад і падаў заяву, каб яго залічылі ў пісьменніцкую арганізацыю. Так праз вобраз суседа К. Крапіва вылучае яшчэ адзін сацыяльна-маральны і мастацкі тып – чалавека-прыстасавальніка. Аўтару яўна недаспадобы «хамелеонскія» якасці героя: можна пераапрануць вопратку цялесную, а не светапогляд – вопратку духоўную.

Варта прыгадаць таксама створаныя на гэтым этапе аднайменныя апавяданні П. Галавача і М. Хведаровіча – «Суседзі», Я. Пазняка «Гутаркі суседзяў». П. Галавач прысвяціў сваё апавяданне «Суседзі» (1928) апісанню суседскіх узаемаадносін, паказу асобы ў коле ўласных і грамадскіх праблем, выявіў зрухі ў светабачанні. Асабістая крыўда, узведзеная ў абсалют, можа прывесці чалавека да духоўнай дэградацыі – такая ідэя сцвярджаецца ў творы. Галоўныя героі апавядання – вяскоўцы Халімон і Хвядос. Халімон вельмі хацеў «выбіцца ў людзі», прыдбаць яшчэ адну валоку зямлі, паставіць новую хату… Яго сусед Хвядос быў бедны, незадаволены вясковым жыццём «грузкім, тупым, збудаваным на клопатах толькі аб сабе». Калі Халімон марыць палепшыць уласнае жыццё, то яго сусед хоча перамен да лепшага для ўсіх і ва ўсім. Перапляценне лёсаў суседзяў Халімона і Хвядоса дае наглядны прыклад таго, што супярэчнасці жыццёвых калізій праецыруюць анталагічную сутнасць і дабра, і зла. Калі ж не спрацоўваюць механізмы для маральнага ўмацавання чалавечых душ, то сілы зла разбураюць арганічныя міжіндывідуальныя сувязі, а затым і грамадства наогул [3, с. 143–144].

Такім чынам, сацыяльнае жыццё 20-х гадоў ХХ стагоддзя з яго супярэчнасцямі абумовіла розныя падыходы да адлюстравання чалавека ў літаратуры. Онім – спецыфічны элемент мастацкай формы, які дапамагае адпаведным чынам маркіраваць і ідэнтыфікаваць асобу літаратурнага героя, узмацняе і ўзбагачае эстэтычнае ўспрыманне твора, асабліва пры ўмове ўключэння ў загаловачны комплекс. Так, онім «суседзі» ў загалоўсках беларускіх апавяданняў 20-х гадоў ХХ стагоддзя не толькі сведчыць пра «тыповасць агульначалавечага лёсу» [2, с. 201], а і рэпрэзентуе пэўны сацыяльны тып, індывідульнае светабачанне чалавека, спрыяе мастацкаму асэнсаванню анталагічных і экзістэнцыйных праблем.

### ЛІТАРАТУРА


1. Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя : у 4 т. – Мінск, 1999–2015. – Т. 2 : 1921–1941. – 1999. – 903 с.
2. Чуковский, К. Современники : портреты и этюды / К. Чуковский. — Минск : Нар асвета, 1985. – 575 с.
3. Шаладонаў, І. М. Выпрабаванне чалавечнасці: беларускае апавяданне 20-х гадоў аб рэвалюцыі і грамадзянскай вайне / І. М. Шаладонаў. – Мінск : Беларус. навука, 2008. – 175 с.




РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ